КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А.В. Макоўчык
« 19 » __________ 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-___/вуч.
УД-26-2-№39-2023/уч.

# ДАПАМОЖНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці:
6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя (зацв. МО РБ ад 02.08.2023 №225) і вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя, прафілізацыі: грамадазнаўчыя дысцыпліны (зацв. 23.02.2023 рэгістрацыйны № 005-2023/у; зацв. 23.02.2023 рэгістрацыйны № 008-2023/уз), сусветная мастацкая культура (зацв. 23.02.2023 рэгістрацыйны № 006-2023/у), экскурсійна-краязнаўчая работа (зацв. 23.02.2023 рэгістрацыйны № 007-2023/у)

**СКЛАДАЛЬНІК:**
**А.А.Сурма**, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі гістарычнага факультэта БДПУ, кандыдат гістарычных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
**І.В.Пугач**, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў гістарычнага факультэта БДПУ, кандыдат гістарычных навук;
**У.М.Кадзіра**, першы прарэктар прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар дзяржаўнай установы
адукацыі «Гімназія № 5 г. Мінска імя
герояў сустрэчы на Эльбе» Ж.Я.Гвозд

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі
(пратакол № 3 ад 31.10.2023 )
Загадчык кафедры В.А.Йоцюс

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 19.12.2023 )

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па курсе «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя.

Прадстаўленая праграма накіравана на забеспячэнне падрыхтоўкі кваліфікаванага выкладчыка (настаўніка гісторыі), які валодае фундаментальнымі ведамі ў галіне антрапанімікі, геральдыкі, нумізматыкі, палеаграфіі, храналогіі і іншых дапаможных гістарычных дысцыплін, які ўмее прымяняць атрыманыя веды на практыцы ў працэсе выкладання гісторыі ў сярэдняй школе.

Курс «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» з'яўляецца міжпрадметнай дысцыплінай, якая інтэгруе веды. Дысцыпліна непасрэдна звязана з такімі навучальнымі дысцыплінамі, як «Археалогія Беларусі», «Этналогія Беларусі», «Краезнаўства Беларусі».

Метадалагічную аснову вучэбнай дысцыпліны складаюць прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці, праблемна-храналагічны і міждысцыплінарны падыходы, а таксама агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя) і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны) метады даследавання.

**Мэта навучальнай дысцыпліны** заключаецца ў засваенні студэнтамі тэарэтычных ведаў у галіне дапаможных гістарычных дысцыпліны і фарміраванні ў іх навыкаў эфектыўнага выкарыстання метадаў і прыёмаў даследавання гістарычных крыніц.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

- засваення навыкаў чытання і палеаграфічнага аналіза пісьмовых помнікаў па гісторыі Беларусі;
- авалодання ведамі ў галіне храналогіі, метралогіі, нумізматыкі, анамастыкі, антрапанімікі, тапанімікі, геральдыкі, сфрагістыкі і ўменнямі выкарыстоўваць іх пры вывучэнні айчыннай і сусветнай гісторыі;
- авалоданне ўменнямі выкарыстоўваць даныя дапаможных гістарычных дысцыплін для арганізацыі вучэбнай і пазакласнай працы настаўніка гісторыі і ў працы гісторыка-вучонага.

У выніку вывучэння навучальнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць**:

- гісторыю станаўлення дапаможных гістарычных дысцыплін як галіны навуковых ведаў;
- асноўныя палажэнні тэорыі і методыкі дапаможных гістарычных дысцыплін;

**умець**:

- чытаць і перакладаць на сучасную мову старажытнарускія і старабеларускія тэксты XI – XVII стст.;
- вызначаць тып тэксту (устаў, паўустаў, скорапіс) і прыкладны час напісання тэксту;
- пераводзіць даты розных каляндарных сістэм на сучаснае летазлічэнне;
- ведаць асноўныя правілы геральдыкі і блазаніраваць герб;
- выкарыстоўваць даныя метралогіі, нумізматыкі, анамастыкі, геральдыкі і сфрагістыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.

**валодаць**:

- паняццямі аб дапаможных гістарычных дысцыплінах, іх месцы і ролі ў сістэме гістарычных навук;
- зместам асноўных дапаможных гістарычных дысцыплін: палеаграфіі, храналогіі, нумізматыкі, метралогіі, тапанімікі, геральдыкі, эпіграфікі, анамастыкі, сфрагістыкі;
- навыкамі навуковай работы з крыніцамі;
- метадамі дапаможных гістарычных дысцыплін пры правядзенні гістарычнага даследавання;
- метадамі выкарыстання дапаможных гістарычных дысцыплін у выкладанні гісторыі ў школе.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнай кампетэнцыі.

Студэнт павінен:

СК-4 – выкарыстоўваць археалагічны і гісторыка-краязнаўчы матэрыял, даныя нумізматыкі, палеаграфіі, геральдыкі, храналогіі ў вывучэнні і выкладанні гісторыі, а таксама для вырашэння даследчых задач.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» па спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя вучэбным планам адводзіцца ўсяго 100 гадзін (3 зач. адз.), з іх: аўдыторных – 48 гадзін (18 гадзін – лекцый, 10 гадзін – практычных і 20 гадзін – семінарскіх заняткаў, з іх 4 гадзіны – кіруемая самастойная работа студэнта), на самастойную працу – 52 гадзіны. Форма кантролю: залік у другім семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя навучальным планам адводзіцца ўсяго 100 гадзін, з іх 12 аўдыторных гадзін: 4 гадзіны – лекцый, 8 гадзін – семінарскіх заняткаў). У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнты здаюць залік на 1 курсе.

## РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ

<table>
<tr><th rowspan="3">Назва вучэбнай дысцыпліны</th><th rowspan="3">Сяместр</th><th colspan="6">Колькасць гадзін навучальных заняткаў</th><th rowspan="3">Самастойная (пазааўдыторная) работа</th><th rowspan="3">Форма кантролю ведаў</th></tr>
<tr><th rowspan="2">усяго</th><th rowspan="2">аўдыторных</th><th colspan="4">З іх</th></tr>
<tr><th>лецыі</th><th>Практычныя заняткі</th><th>Семінарскіе заняткі</th><th>КСРС</th></tr>
<tr><td>Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны</td><td>2</td><td>100</td><td>48</td><td>16</td><td>10</td><td>18</td><td>4</td><td>52</td><td>залік</td></tr>
</table>

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны ў сістэме гістарычных навук

Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны і іх месца ў гістарычнай навуцы. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны і крыніцазнаўства. Прадмет даследавання дапаможных гістарычных дысцыплін. Іх сувязь паміж сабой і з іншымі навукамі (гісторыяй, археалогіяй, этналогіяй, мовазнаўствам, астраноміяй, матэматыкай і інш.).

Зараджэнне і развіццё дапаможных гістарычных дысцыплін. Практычны, прыкладны і навукова-тэарэтычны перыяды развіцця дапаможных гістарычных дысцыплін. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны на сучасным этапе. Умоўнасць назвы.

Роля дапаможных гістарычных дысцыплін у гістарычных даследаваннях. Выкарыстанне матэрыялу дапаможных гістарычных дысцыплін у рабоце настаўніка гісторыі.

Літаратура па курсу «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны». Яе аналіз.

### Тэма 2. Палеаграфія ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін

Прадмет, задачы і метады палеаграфіі. Крыніцы вывучэння палеаграфіі. Сувязь з іншымі навукамі: эпіграфікай, храналогіяй, археаграфіяй, дыпламатыкай, філіграналогіяй і інш. Гісторыя развіцця палеаграфіі. Вылучэнне берасталогіі і філіграналогіі.

Практычнае выкарыстанне даных палеаграфіі ў гістарычных даследаваннях: вызначэнне часу і месца стварэння, іх сапраўднасці ці падробленасці, аўтараў рукапісаў. Паняцце звода, ізвода, пратографа, спіса.

Выкарыстанне палеаграфічных матэрыялаў у працы настаўніка гісторыі.

Паходжанне славянскай пісьменнасці. Сведчанні аб існаванні дакірылічнай пісьменнасці. Кірыліца і глаголіца: пытанні аб часе ўзнікнення, аўтарстве і першаснасці. Кірыліца. Паходжанне і гукавае значэнне літар. Абазначэнне лічбаў літарамі. Надрадковыя знакі. Помнікі пісьменнасці ўсходнеславянскіх народаў.

### Тэма 3. Графічныя тыпы кірылічнага пісьма

Матэрыял і прылады для пісьма. Пергамен: гісторыя ўзнікнення, тэхналогія выпрацоўкі, палімпсесты. Папера: гісторыя ўзнікнення, тэхналогія вырабу, бамбіцына, філіграні. Выраб паперы ў Рэчы Паспалітай, гербы на вадзяных знаках. Выкарыстанне бяросты і цэры, стыляў як прылад для пісьма. Чарніла і фарбы, выкарыстанне золата і серабра. Гусіныя пёры, алоўкі, пэндзалі, хараксала, кружала і іншыя прылады для пісьма і аздаблення. Фармат рукапісаў.

Вязь як від дэкаратыўнага пісьма, лігатурыраванне, штамбаванне, паказчык вязі. Прычыны змянення графікі пісьма.

Упрыгожванне рукапісаў. Застаўкі, ініцыялы, калафоны. Арнаменты: старавізантыйскі або геаметрычны, тэраталагічны, новавізантыйскі, балканскі,

старадрукаваны арнамент, барока, ракако, стыль Людовіка XVI, ампір. Мініяцюры.

Устаў, паўустаў і скорапіс і вязь як графічныя тыпы кірылічнага пісьма. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма.

**Тэма 4. Устаў як графічная разнавіднасць пісьма**

Графіка пісьма. Крыніцы XI ст., іх характэрныя прыкметы. Крыніцы XII ст., іх характэрныя прыкметы. Крыніцы XIII ст. і іх характэрныя прыкметы. Аздабленне рукапісаў. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма.

**Тэма 5. Паўустаў як графічная разнавіднасць пісьма**

Графіка пісьма. Крыніцы XIV ст., іх характэрныя прыкметы. Крыніцы XV ст., іх характэрныя прыкметы. Аздабленне рукапісаў. Праблема змены графікі літар. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма.

**Тэма 6. Скорапіс як графічная разнавіднасць пісьма**

Графіка пісьма. Крыніцы XVI ст., іх характэрныя прыкметы. Крыніцы XVII ст., іх характэрныя прыкметы. Крыніцы XVIII ст., іх характэрныя прыкметы. Аздабленне рукапісаў. Праблема змены графікі літар. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма.

**Тэма 7. Геральдыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна**

Прадмет, аб’ект і задачы геральдыкі. Крыніцы вывучэння геральдыкі. Этапы развіцця геральдыкі. Сувязь геральдыкі з іншымі навукамі. Знешнія і ўнутраныя прычыны ўзнікнення геральдыкі. Інстытут герольдаў.

Тэарэтычная геральдыка. Асноўныя геральдычныя тэрміны. Віды гербоў. Састаўныя часткі герба: шчыт, шлем, карона, бурэлет, клейнод, намёт, мантыя, дэвіз, пастамент. Віды шчытоў. Геральдычныя фігуры: фігуры дзялення, геральдычныя фігуры першага і другога парадку, негеральдычныя фігуры (натуральныя, штучныя і фантастычныя). Эмалі, металы і футры. Асноўнае правіла геральдыкі. Шрафіроўка. Блазаніраванне герба.

**Тэма 8. Практычная геральдыка**

Гарадскія гербы Беларусі. Асноўныя этапы існавання: гісторыя ўзнікнення, існаванне ў часы ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, пасля рэвалюцыі 1917 г., перыяд “турысцкага значыка”, перыяд адраджэння.

Уласныя гербы. Знакі Рурыкавічаў. “Сарматызм” і “рымскае паходжанне” шляхты. Адметныя рысы беларускіх уласных гербаў.

Гербы аб’яднанняў. Гісторыя ўзнікнення і існавання.

Дзяржаўныя гербы Рэспублікі Беларусь: гісторыя стварэння і існавання.

Адраджэнне гербавай сімволікі: асноўныя шляхі і тэндэнцыі.

Далейшыя напрамкі развіцця геральдыкі: лагатыпізацыя, паняцце сімвала і эмблемы.

**Тэма 9. Блазаніраванне гарадскіх гербоў Рэспублікі Беларусь**

Віды гербоў. Правілы блазаніравання. Эмалі і металы на гарадскіх гербах. Геральдычныя і негеральдычныя фігуры на гарадскіх гербах.

Гісторыя стварэння і існавання гарадскіх гербоў. Гарадскія гербы да падзелаў Рэчы Паспалітай. Гарадскія гербы пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Адраджэнне і наданне гарадскіх гербоў у Рэспубліцы Беларусь.

**Тэма 10. Храналогія як дапаможная гістарычная дысцыпліна**

Матэматычная (астранамічная) і гістарычная храналогія. Тэарэтычныя і практычныя задачы храналогіі. Сувязь храналогіі з іншымі навукамі. Узнікненне і развіццё храналогіі як дапаможнай гістарычнай дысцыпліны. Датаванне гістарычных падзей і крыніц. Датаванне па ўскосных даных. Выкарыстанне матэрыялаў гістарычнай храналогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі. Літаратура па курсе, яе аналіз.

**Тэма 11. Час і яго вымярэнне**

Паняцце года, месяца, тыдня, сутак, гадзіны. Месяцовыя, сонечныя і месяцова-сонечныя каляндары. Старажытныя каляндарныя сістэмы: старажытнаегіпецкая, вавілонская, старажытнагрэчаская, рымская, старажытнаяўрэйская. Юліянскі, грыгарыянскі і новаюліянскі каляндар. Мусульманскі каляндар. Каляндар французскай рэвалюцыі. Спробы стварэння сусветнага каляндара.

Назвы месяцаў і дзён тыдня. Паняцце эры.

Сістэма вымярэння часу ўсходнеславянскімі народамі. Сакавіцкі, ультрасакавіцкі, вераснёўскі і студзеньскі стылі. Методыка храналагічных даследаванняў.

**Тэма 12. Практычная храналогія**

Вызначэнне года ад стварэння света і перавод на даты нашай эры**.** Вызначэнне даты падзеі. Пераходзячыя і непераходзячыя святы. Вызначэнне дня святкавання Пасхі. Вызначэнне дня тыдня. Формула Беражкова.

**Тэма 13. Сфрагістыка**

Прадмет, аб’ект і задачы сфрагістыкі. Крыніцы вывучэння сфрагістыкі. Развіццё сфрагістыкі як дапаможнай гістарычный дысцыпліны. Паняцце пячаткі. Паняцце матрыцы і адбітка. Сфрагістычная тэрміналогія: працоўная паверхня, выява, легенда. Віды пячатак: прывесістыя, прыціскныя, прыкладныя, маліўдавулы, аргіравулы, хрысавулы, васковыя, воска-масцічныя, масцікавыя, курадымныя пячаткі.

Методыка даследавання пячатак.

**Тэма 14. Гісторыя існавання пячатак на тэрыторыі Беларусі**

Пячаткі на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян: першыя ўпамінанні і праблема знешняга выгляду. Пячаткі Х ст. Пячатка Ізяслава Ўладзіміравіча: знешні выгляд і сувязі з геральдычнай традыцыяй (знакі Рурыкавічаў). Пячаткі XII–XIII ст.: знешні выгляд і матэрыял. Булы архаічнай традыцыі, грэка-рускія пячаткі. Пячаткі епіскапаў, князёў, жаночыя пячаткі: знешні выгляд і адрозненні. Пячаткі ДЬНЕСЛОВО. Пячаткі XV–XVIII стст.: знешні выгляд і матэрыял адбіткаў, заканадаўчае пацверджанне прымянненя пячатак. Пячаткі ўласныя і дзяржаўныя. Пячаткі XIX–XX стст.

**Тэма 15. Гістарычная метралогія як дапаможная гістарычная дысцыпліна**

Прадмет і задачы гістарычнай метралогіі. Яе роля ў гістарычных даследаваннях. Сувязь метралогі з іншымі навукамі. Метралагічныя крыніцы. Гісторыя станаўлення і развіцця метралогіі. Практычнае выкарыстанне даных метралогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.

**Тэма 16. Метралогія ад старажытных часоў да ХХ ст.**

Метралогія ўсходнеславянскіх народаў. Меры даўжыні, паверхні, вагі і аб’ёму сыпкіх і вадкіх рэчываў.

Уніфікацыя мер у Вялікім княстве Літоўскім і Расійскай дзяржаве. Наўгародская і Маскоўская сістэмы. Меры даўжыні, плошчы, вагі, аб’ёма, меры падаткаабкладання.

Выкарыстанне англійскіх мер і змена ў сувязі з гэтым мер даўжыні і паверхні. Удакладненне мер у сувязі з развіццём капіталістычных адносін. Метрычная сістэма мер і пытанне аб яе ўвядзенні. Увядзенне метрычнай сістэмы мер. Яе характарыстыка. Эталоны мер.

**Тэма 17. Нумізматыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна. Грашовае абарачэнне з антычнасці да XIII ст.**

Нумізматыка як навука. Баністыка, фалерыстыка. Скарбы як асноўны аб’ект для нумізматычных даследаванняў. Віды і датаванне скарбаў. Сувязь нумізматыкі з іншымі навукамі. Літаратура па нумізматыцы. Гісторыя ўзнікнення нумізматыкі. Выкарыстанне даных нумізматыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі. Нумізматычная тэрміналогія. Грошы, іх віды і функцыі.

Антычныя манеты на беларускай зямлі. Першы безманетны перыяд. Арабскія, візантыйскія, кіеўскія і наўгародскія манеты. Заходнееўрапейскія дэнарыі. Шляхі паступлення манет. Геаграфія размяшчэння скарбаў. Другі безманетны перыяд. Дыскусія аб яго прычынах. Літоўскія, кіеўскія, наўгародскія і чарнігаўскія грыўні.

**Тэма 18. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі**

Грашовае абарачэнне ў XIV-XVI стст. Пражскі грош. Літоўскія дэнарыі. Манеты Польшчы, Лівонскага ордэна, Залатой арды і іншых краін.

Манеты Вялікага княства Літоўскага. Узаемаадносіны паміж манетамі Вялікага княства Літоўскага і польскімі манетамі. Талеры. Чаканка білонавых манет. Паступленне на тэрыторыю Беларусі манет Лівоніі, шведскай Прыбалтыкі, Расіі, Прусіі і іншых краін.

Грашовае абарачэнне ў XVII – XVIII стст. Фінансавы крызіс. Чаканка меднай, білонавай і сярэбранай манеты. Барацінкі і тымфы. Манеты Расіі і Прусіі.

Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII – XIX стст. Асаблівасці грашовага абарачэння Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Увядзенне залатога монаметалізму.

Грашовае абарачэнне ў час першай сусветнай вайны.

Грашовае абарачэнне ў савецкі час. Развал грашовай сістэмы ў час грамадзянскай вайны. Падрыхтоўка і правядзенне грашовай рэформы 1922-24 гг. Чаканка бронзавых і нікелевых манет. Грашовыя рэформы 1947 і 1961 гг. Юбілейныя і памятныя манеты. Грашовая сістэма ў канцы XX – пачатку XXI ст.

**Тэма 19. Гістарычная анамастыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна**

Прадмет і задачы гістарычнай анамастыкі. Тапаніміка, этнаніміка і антрапаніміка. Сувязь анамастыкі з мовазнаўствам, гісторыяй, геаграфіяй, сацыялогіяй і іншымі дысцыплінамі. Сацыяльная абумоўленасць асабістых імён. Фарманты асабістых імён і іх вывучэнне. Выкарыстанне даных анамастыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі. Літаратура па тэме, яе аналіз.

**Тэма 20. Гістарычная тапаніміка і антрапаніміка**

Антрапаніміка як навука. Сацыяльная абумоўленасць асабістых імён у мінулым. Дахрысціянскія і хрысціянскія імёны. Княжацкія імёны. Жаночыя і мужчынскія імёны. Прозвішчы і мянушкі. Асаблівасці прозвішчаў і імён у розных сацыяльных групах. Імянная мода.

Гістарычная тапаніміка як навука. Сувязь тапанімікі з мовазнаўствам, гісторыяй і геаграфіяй. Тапанімічная тэрміналогія. Мікратапаніміка, макратапаніміка і мезатапаніміка. Адлюстраванне ў геаграфічных назвах этнагенезу, міграцыі насельніцтва, эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага жыцця грамадства. Тапанімічны субстрат. Гідронімы. Назвы населеных пунктаў. Тапаніміка Беларусі і роднага краю. Угра-фінскія, балцкія, славянскія і іншыя назвы геаграфічных аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы, заняткa | Назва раздзела, тэмы (пералік вывучаемых пытанняў) | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (нагляднья, метадычныя дапаможнікі і навучання г.д.) | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | | |
| 2 сяместр | | | | | | | | | |
| **1.** | **Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны ў сістэме гістарычных навук**<br>1. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны і іх месца ў гістарычнай навуцы<br>2. Зараджэнне і развіццё дапаможных гістарычных дысцыплін<br>3. Роля дапаможных гістарычных дысцыплін у гістарычных даследаваннях<br>4. Літаратура па курсу «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» | 2 | | | | 4 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны ў сістэме гістарычных навук» | [1, 2, 5] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне |
| **2.** | **Палеаграфія ў сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін** | 2 | | | | 4 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Палеаграфія ў | [1, 2] | Кантроль канспектаў, вуснае |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Прадмет, задачы і метады палеаграфіі<br>2. Практычнае выкарыстанне даных палеаграфіі ў гістарычных даследаваннях<br>3. Выкарыстанне палеаграфічных матэрыялаў у працы настаўніка гісторыі<br>3. Паходжанне славянскай пісьменнасці | | | | | | сістэме дапаможных гістарычных дысцыплін» | | апытанне |
| **3.** | **Графічныя тыпы кірылічнага пісьма**<br>1.Матэрыялы і прылады для пісьма<br>2. Вязь як від дэкаратыўнага пісьма<br>3. Упрыгожванне рукапісаў<br>4. Устаў, паўустаў і скорапіс і вязь як графічныя тыпы кірылічнага пісьма<br>5. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма | | | 2 | 2 (С) | 4 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Графічныя тыпы кірылічнага пісьма», практыкум, рабочы сшытак | [1, 3, 5] | Праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |
| **4.** | **Устаў як графічная разнавіднасць пісьма**<br>1. Крыніцы XI ст., іх характэрныя прыкметы<br>2. Крыніцы XII ст., іх характэрныя прыкметы<br>3. Крыніцы XIII ст. і іх характэрныя прыкметы<br>4. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма | | 2 | | | 4 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Устаў як графічная разнавіднасць пісьма», практыкум, рабочы сшытак | [1, 3, 5] | Праверка рабочых сшыткаў, чытанне і аналіз тэкстаў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.** | **Паўустаў як графічная разнавіднасць пісьма**<br>1. Крыніцы XIV ст., іх характэрныя прыкметы<br>2. Крыніцы XV ст., іх характэрныя прыкметы<br>3. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма | | 2 | | | 4 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Паўустаў як графічная разнавіднасць пісьма», практыкум, рабочы сшытак | [1, 3, 5] | Праверка рабочых сшыткаў, чытанне і аналіз тэкстаў |
| **6.** | **Скорапіс як графічная разнавіднасць пісьма**<br>1. Крыніцы XVI ст., іх характэрныя прыкметы<br>2. Крыніцы XVII ст., іх характэрныя прыкметы<br>3.Крыніцы XVIII ст., іх характэрныя прыкметы<br>4. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма | | 2 | | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Скорапіс як графічная разнавіднасць пісьма», практыкум, рабочы сшытак | [1, 3, 5] | Праверка рабочых сшыткаў, чытанне і аналіз тэкстаў |
| **7.** | **Геральдыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна**<br>1. Прадмет, аб’ект і задачы геральдыкі.<br>2. Крыніцы вывучэння і этапы развіцця геральдыкі. Сувязь геральдыкі з іншымі навукамі<br>3. Знешнія і ўнутраныя прычыны ўзнікнення геральдыкі<br>4. Тэарэтычная геральдыка<br>4.Блазаніраванне герба | 2 | | | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Геральдыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна» | [1, 3, 6] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне |
| **8.** | **Практычная геральдыка**<br>1. Гарадскія гербы Беларусі | | | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне | [1, 3, 6] | Праверка рабочых |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Уласныя гербы<br>3. Гербы аб’яднанняў<br>4. Дзяржаўныя гербы Рэспублікі Беларусь | | | | | | «Практычная геральдыка», практыкум, рабочы сшытак | | сшыткаў, вуснае апытанне |
| **9.** | **Блазаніраванне гарадскіх гербоў Рэспублікі Беларусь**<br>1. Правілы блазаніравання<br>2. Віды гербоў<br>3. Эмалі і металы на гарадскіх гербах Беларусі<br>4. Геральдычныя і негеральдычныя фігуры на гарадскіх гербах | | | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Блазаніраванне гарадскіх гербоў Рэспублікі Беларусь», практыкум, рабочы сшытак | [1, 3, 6] | Праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |
| **10.** | **Храналогія як дапаможная гістарычная дысцыпліна**<br>1. Тэарэтычныя і практычныя задачы храналогіі<br>2. Сувязь храналогіі з іншымі навукамі<br>3. Узнікненне і развіццё храналогіі як дапаможнай гістарычнай дысцыпліны<br>4. Выкарыстанне матэрыялаў гістарычнай храналогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі<br>5. Літаратура па курсе, яе аналіз | 2 | | | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Храналогія як дапаможная гістарычная дысцыпліна» | [1] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне |
| **11.** | **Час і яго вымярэнне**<br>1.Паняцце года, месяца, сутак, тыдня<br>2. Месяцовыя, сонечныя і | | | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Час і яго вымярэнне», практыкум, рабочы | [1, 3] | Праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | месяцова-сонечныя каляндары<br>3.Старажытныя каляндарныя сістэмы<br>4. Методыка храналагічных даследаванняў | | | | | | сшытак | | |
| **12.** | **Практычная храналогія**<br>1. Вызначэнне года ад стварэння света і перавод на даты нашай эры<br>2. Вызначэнне даты падзеі<br>3. Вызначэнне дня святкавання Пасхі<br>4. Формула Беражкова | | 4 | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Рашэнне задач па храналогіі», Практыкум, тэсты, рабочы сшытак | [1, 3] | Рашэнне храналагічных задач, праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |
| **13.** | **Сфрагістыка**<br>1. Прадмет, аб’ект і задачы сфрагістыкі<br>2. Крыніцы вывучэння сфрагістыкі<br>3. Сфрагістычная тэрміналогія<br>4. Развіццё сфрагістыкі як дапаможнай гістарычный дысцыпліны<br>5. Віды пячатак | | | | 2 (Л) | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Сфрагістыка» | [1, 5] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне |
| **14.** | **Гісторыя існавання пячатак на тэрыторыі Беларусі**<br>1. Пячаткі на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян<br>2. Пячаткі Х ст.<br>2. Пячаткі ХІІ–ХІІІ ст.: знешні выгляд і матэрыял<br>3. Пячаткі ХV–ХVІІІ стст.: знешні выгляд і матэрыял | | | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Гісторыя існавання пячатак на тэрыторыі Беларусі», практыкум, рабочы сшытак | [1, 5] | Праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | адбіткаў<br>4.Пячаткі XIX–XX стст | | | | | | | | |
| **15.** | **Гістарычная метралогія як дапаможная гістарычная дысцыпліна**<br>1. Прадмет і задачы гістарычнай метралогіі<br>2. Метралагічныя крыніцы<br>3. Гісторыя станаўлення і развіцця метралогіі<br>4. Практычнае выкарыстанне даных метралогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі | 2 | | | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Гістарычная метралогія як дапаможная гістарычная дысцыпліна» | [1, 2, 4] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне, тэст |
| **16.** | **Метралогія ад старажытных часоў да XX ст.**<br>1.Метралогія усходнеславянскіх народаў<br>2. Уніфікацыя мер у Вялікім княстве Літоўскім і Расійскай дзяржаве<br>3. Выкарыстанне англійскіх мер і змена ў сувязі з гэтым мер даўжыні і паверхні<br>4. Удакладненне мер у сувязі з развіццём капіталістычных адносін<br>5. Увядзенне метрычнай сістэмы мер | | | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Метралогія ад старажытных часоў да XX ст.», практыкум, рабочы сшытак | [1, 2] | Рашэнне задач па метралогіі, праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |
| **17.** | **Нумізматыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна. Грашовае абарачэнне з** | 2 | | | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Нумізматыка як | [1, 6, 8] | Кантроль канспектаў, вуснае |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **антычнасці да XIII ст.**<br>1. Нумізматыка як навука<br>2. Гісторыя ўзнікнення нумізматыкі<br>3. Выкарыстанне даных нумізматыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.<br>4. Антычныя манеты на беларускай зямлі<br>5. Першы і другі безманетны перыяды<br>6. Куфічны дырхем, заходнееўрапейскі дэнарый | | | | | | дапаможная гістарычная дысцыпліна. Грашовае абарачэнне з антычнасці да XIII ст.» | | апытанне |
| **18.** | **Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі**<br>1. Грашовае абарачэнне XIV-XVI стст.<br>2. Грашовае абарачэнне XVII-XVIII стст.<br>3. Грашовае абарачэнне XVIII-XIX стст.<br>4. Грашовае абарачэнне ў савецкі час<br>5 Грашовая сістэма ў канцы XX – пачатку XXI ст. | 2 | | 2 | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі» | [1, 6, 8] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне |
| **19.** | **Гістарычная анамастыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна**<br>1. Прадмет і задачы гістарычнай анамастыкі<br>2. Тапаніміка, этнаніміка і | 2 | | | | 2 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Гістарычная анамастыка як дапаможная гістарычная | [3] | Кантроль канспектаў, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | антрапаніміка<br>3. Фарманты асабістых імёнаў і іх вывучэнне<br>4. Выкарыстанне даных анамастыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі<br>5. Літаратура па тэме, яе аналіз | | | | | | дысцыпліна» | | |
| **20.** | **Гістарычная тапаніміка і антрапаніміка**<br>1. Гістарычная антрапаніміка як навука<br>2.Гістарычная тапаніміка як навука | | | 2 | | 4 | Мульцімедыйнае суправаджэнне «Гістарычная тапаніміка і антрапаніміка», практыкум, рабочы сшытак | [1, 2] | Рашэнне практычных задач па анамастыцы, праверка рабочых сшыткаў, вуснае апытанне |
| | **Усяго гадзін** | **16** | **10** | **18** | **4** | **52** | | | **Залік** |

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя (завочная форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы (пералік вывучаемых пытанняў) | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і г.д.) | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
